2. *Медвецкий, А. В.* Белорусская портретная живопись второй половины XX – начала XXI веков : автореф. дис. … канд. искусствоведения : 17.00.04 / А. В. Медвецкий ; Нац. акад. наук Беларуси, Гос. науч. учрежд. «Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы НАН Беларуси». – Минск, 2012. – 24 с.

3. *Шаройко, Е. Н.* Жанровые модификации фильма-портрета в контексте православной тематики / Е. Н. Шаройко // Этносоциальные и конфессиональные процессы в современном обществе : материалы VIII Междунар. науч. конф., Гродно, 10–11 дек. 2009 г. – Гродно, 2010. – С. 245–248.

4. *Шур, Г.* Гісторыка-культуралагічны напрамак : ад адлюстравання да вобраза / Г. Шур // Гісторыя кінамастацтва Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2004. – Т. 4 : 1986–2003 гг. / Л. М. Зайцава [і інш.]. – 2004. – С. 207–217.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*К. В. Суша, саіскальнік вучонай ступені*
*кандыдата культуралогіі БДУКМ*
*Навуковы кіраўнік – А. І. Смолік,*
*загадчык кафедры культуралогіі,*
*доктар культуралогіі, прафесар*

## УНІВЕРСАЛЬНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

Энцыклапедыя як арганізаваны на прынцыпах гіпертэксту нелінейны тэкст-рызома з’яўляецца адным з асноўных вобразаў сучаснай культуры [7]. Гэта «карта культуры», сістэмная мадэль навакольнага свету, фармалізацыя і структураванне бясконцай разнастайнасці засвоенага чалавекам быцця. Менавіта энцыклапедыя задоўга да з’яўлення электронных носьбітаў інфармацыі прапанавала новы, нелінейны метад чытання, які атрымаў велізарнае развіццё ў інфармацыйным грамадстве.

Паняцце «энцыклапедыя» ўзыходзіць да старажытнагрэчаскага *enkyklios paideia*. Гэты тэрмін з’явіўся ў антычнасці як абазначэнне сукупнасці тых абавязковых ведаў, якімі павінен авалодаць чалавек, які належыць да адукаванага кола грамадства. *Enkyklios paideia* адлюстроўваў ідэю арганічнай цэльнасці, адзінства, закончанасці агульнай адукацыі. Візантыйская культура на працягу доўгіх стагоддзяў захоўвала антычныя традыцыі ўжывання паняцця *«enkyklios paideia»* і вытворных выразаў [6, с. 49].

У сярэднія вякі тэрмін «энцыклапедыя» знікае з ужытку і зноў з'яўляецца толькі ў эпоху Адраджэння. Слова «энцыклапедыя» неаднаразова згадваецца ў працах гуманістаў Высокага Адраджэння, якія імкнуліся адрадзіць яго антычнае разуменне і падкрэсліць разнастайнасць ведаў, ахопленых гэтым паняццем. З XVI ст. у Заходняй Еўропе яно стала выкарыстоўвацца ў значэнні «зборнік разнастайнага зместу». У 1630 г. пратэстанцкі тэолаг і педагог І. Г. Альштэд выдаў «Энцыклапедыю, падзеленую на сем частак», у прадмове да якой напісаў: «Энцыклапедыя ёсць сістэматычны ахоп ўсіх рэчаў, якія падлягаюць ў гэтым жыцці чалавечаму вывучэнню. Карацей, яна ёсць сукупнасць ведаў» [5, с. 277]. У канцы XVII ст. гэта паняцце стала абазначаць класіфікацыю навук і сістэматызацыю ведаў.

У 1728 г. Э. Чэмберс ужыў слова «энцыклапедыя» ў дачыненні да працы з алфавітным размяшчэннем матэрыялу – «Энцыклапедыя, або Ўсеагульны слоўнік мастацтваў і навук». Асноўнай часткай слоўніка папярэднічала дэталёва распрацаваная карта ведаў. Словаўжыванне Э. Чэмберса запазычылі Д. Дзідро і Ж. Д'Аламбер, якія таксама далі ў пачатку сваёй працы «Энцыклапедыя, або Тлумачальны слоўнік навук, мастацтваў і рамёстваў» (1751–1780) шырокую класіфікацыю навук.

З XIX ст. тэрмін «энцыклапедыя» пачаў выкарыстоўвацца для абазначэння, як правіла, калектыўных прац, якія маюць сваёй мэтай адлюстраваць увесь назапашаны чалавецтвам запас ведаў. У рускую мову гэта слова ўвайшло разам з працай Д. Дзідро і Ж. Д'Аламбера і першапачаткова ўжывалася ў Расіі выключна ў дачыненні да дадзенага твора. Для ўніверсальнага слоўніка яно ўпершыню было ўжыта С. М. Южаковым («Вялікая энцыклапедыя», Санкт-Пецярбург, 1900–1909) ужо ў пачатку XX ст.

Гісторыя энцыклапедыі налічвае некалькі тысячагоддзяў [8; 9]. Працы энцыклапедычнага характару з'явіліся ў Старажытным Егіпце і Кітаі ў II тыс. да н. э. [1]. Пачынальнікам жанру энцыклапедыі на еўрапейскай глебе лічыцца рымскі вучоны Марк Тэрэнцый Варон (116–27 гг. да н. э.), які аб'яднаў у цяпер згубленай 9-томнай працы «Навукі» («Disciplinae») звесткі па сямі вольных мастацтвах, а таксама медыцыне і архітэктуры. Найбольш поўнай з энцыклапедый антычнасці, якія дайшлі да нас, з'яўляецца «Натуральная гісторыя» Плінія Старэйшага (23–79 гг. н. э.) у 37 кнігах [5, с. 280–281]. Пачынаючы з I ст. творы энцыклапедычнага характару актыўна ствараліся ў краінах арабскай пісь-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

меннасці (некаторыя з іх былі перакладзены і атрымалі значнае распаўсюджванне ў Еўропе) [3]. У сярэднія вякі ў Заходняй Еўропе ў абарачэнні знаходзілася мноства сістэматычных энцыклапедый – «зярцалаў», «кампендыумаў», «сум», а таксама тлумачальных слоўнікаў малаўжывальных слоў і выразаў – гласарыяў. У эпоху Рэнесанса энцыклапедычныя працы набылі характар папулярных навукова-практычных дапаможнікаў.

У XVIII–XIX стст. станаўленне нацый суправаджалася з'яўленнем універсальных энцыклапедый сучаснага тыпу. У XVIII ст. выданне фундаментальных універсальных энцыклапедый на нацыянальных мовах ажыццявілі французы, англічане і немцы. У XIX ст. стварэнне ўніверсальных энцыклапедый адлюстравала працэс станаўлення нацыянальнай самасвядомасці ў многіх краінах свету, у тым ліку ў Італіі, Аўстрыі, Польшчы, Даніі, Швецыі, Партугаліі, Нідэрландах, Чэхіі, Расіі, Аўстраліі, ЗША. У XX ст. да ліку дзяржаў, якія падрыхтавалі і выдалі значныя ўніверсальныя энцыклапедычныя працы, далучылася і Беларусь. Значэнне гэтай падзеі для беларускай культуры можна праілюстраваць словамі І. Мележа, які ў выступленні на Пленуме праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі 25 лістапада 1966 г. назваў першую ўніверсальную энцыклапедыю беларускага народа «самым значным выданнем за паўстагоддзя беларускай культуры» [2, с. 27].

У 90-я гг. XX ст. з развіццём інфармацыйных тэхналогій пачалі з'яўляцца электронныя энцыклапедыі на кампакт-дысках і ў Інтэрнэце («Encarta», «Брытаніка», «Вялікая энцыклапедыя Кірыла і Мяфодзія», «Кругасвет», «Рубрыкон»). Асноўным напрамкам развіцця сучасных электронных энцыклапедый з'яўляецца тэхналогія мультымедыя, якая забяспечвае інтэрактыўнасць і аднachасовае прадстаўленне розных відаў дадзеных – тэксту, гуку, статычнай і дынамічнай графікі. У XXI ст. велізарную папулярнасць атрымала ідэя свабоднай універсальнай энцыклапедыі, найбольш вядомым увасабленнем якой з'яўляецца Вікіпедыя.

Энцыклапедычнае пазнанне накіравана на ўсебаковае – гістарычнае, геаграфічнае, этнаграфічнае, сацыяльна-эканамічнае, культуралагічнае – асэнсаванне месца народа, які стварае энцыклапедыю, у бясконцай сусветнай разнастайнасці, вызначэнне свайго месца ў энцыклапедычнай карціне свету [4]. Нацыянальная ўніверсальная энцыклапедыя адлюстроўвае свет такім, якім яго бачаць яе стваральнікі як прадстаўнікі пэўнай культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

эпохі, нацыі, са сваімі светапоглядными акцэнтамі. У гэтым сэнсе ўніверсальная энцыклапедыя з'яўляецца тэкстам культуры і ўтрымлівае інфармацыю пра грамадства, час і рэгіён, дзе яна была створана, у тым ліку пра ідэалы, каштоўнасці, нормы, традыцыі, ідэалогію, самаідэнтыфікацыю, менталітэт, нацыянальную карціну свету і іншыя структурныя элементы культуры.

З гэтага пункту гледжання каштоўнасць нацыянальнай універсальнай энцыклапедыі вызначаецца тым, наколькі поўна яна адлюстроўвае самабытную карціну свету нацыі, якая яе стварае. Кожная нацыянальная энцыклапедыя ўяўляе каштоўнасць для культуры чалавецтва і ні адна з іх не можа цалкам замяніць іншую, паколькі яны адлюстроўваюць розныя ракурсы погляду на свет, розныя спосабы яго асэнсавання, розныя мадэлі ўпарадкавання ведаў аб свеце. Тым самым кожная з іх ўзбагачае скарбніцу культуры чалавецтва.

Універсальная энцыклапедыя з'яўляецца аўтарытэтнай, шырока распаўсюджанай і даступнай крыніцай інфармацыі, да якой часта звяртаюцца чытачы рознага ўзросту і адукацыйнага ўзроўню з мэтай задавальнення сваіх інфармацыйных патрэбаў. Яна здольна аказваць значны ўплыў на светапогляд, сістэму каштоўнасцей, карціну свету сваіх чытачоў. Універсальная энцыклапедыя заўсёды ствараецца ў рамках пэўнай сістэмы поглядаў і ідэй, у якіх усведамляюцца і ацэньваюцца адносіны людзей да рэчаіснасці і адзін да аднаго; з'яўляецца носьбітам гэтых ідэяй і іх праваднікам у шырокае чытацкае асяроддзе. Вопыт падрыхтоўкі і выдання беларускіх універсальных энцыклапедый, у тым ліку фарміраванне адпаведных навуковых кадраў, распрацоўка навуковай тэрміналогіі, стандартызацыя тэрмінаў, даследаванне многіх важных навуковых праблем, упершыню ажыццёўленае пры падрыхтоўцы энцыклапедый, грамадскі рэзананс такой значнай падзеі для культурнага жыцця краіны, сведчыць аб значным уплыве яе на развіццё нацыянальнай самасвядомасці.

Энцыклапедыя дынамічна развіваецца ў адпаведнасці са зменамі ў грамадстве, яна трывала ўвайшла ў жыццё сучаснага чалавека. Сёння энцыклапедыя ўсё часцей ўсведамляецца як самабытная з'ява культуры, якая ўяўляе сабой помнік пэўнай эпохі, транслюе культуру ад пакалення да пакалення, служыць захаванню і прымнажэнню культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Дробинский, А. И.* У истоков энциклопедической литературы: энциклопедические явления в культурах Древнего Востока / А. И. Дробинский // Книга : исследования и материалы. – 1974. – Сб. 19. – С. 155–182.

2. Імя Петруся Броўкі Беларуская Энцыклапедыя / уклад. Л. В. Календа. – Мінск : БелЭн, 2005. – 264 с.

3. *Крачковский, И. Ю.* Арабские энциклопедии Средневековья / И. Ю. Крачковский // Труды Института книги, документа и письма. – Л., 1932. – Вып. 2 : Статьи по истории энциклопедии. – С. 15–22.

4. *Пастухович, Е. Ф.* Отражение картины мира в энциклопедических текстах / Е. Ф. Пастухович // Когнитивная лингвистика конца XX века : материалы междунар. науч. конф., 7–9 окт. 1997 г. : в 3 ч. – Минск, 1997. – Ч. 1. – С. 191–192.

5. *Симон, К.* Энциклопедия / К. Симон, А. Дробинский // Энциклопедический словарь Гранат : в 58 т. – 7-е изд. – М., 1948. – Т. 54. – С. 277–345.

6. *Симон, К. Р.* Термины «энциклопедия» и «свободные искусства» в их историческом развитии / К. Р. Симон // Избранное. – М., 1984. – С. 45–67.

7. *Эко, У.* От Интернета к Гутенбергу / У. Эко // Общество и книга: от Гутенберга до Интернета. – М., 2001. – С. 275–279.

8. *Якушева, Г.* Книга, у которой не будет конца: история энциклопедического жанра / Г. Якушева // Книжное дело. – 1993. – № 4. – С. 78–83.

9. *Stockwell, F.* A History of Information Storage and Retrieval / F. Stockwell. – London : McFARLAND, 2001. – 200 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ся Лэй, соискатель ученой степени*
*кандидата искусствоведения БГУКИ*
*Научный руководитель – Е. Е. Корсакова,*
*кандидат искусствоведения, доцент*

# ВЗАИМОДЕЙСТВИЕ И СОТРУДНИЧЕСТВО КИТАЯ И БЕЛАРУСИ В ОБЛАСТИ СКУЛЬПТУРЫ

Сотрудничество между Китаем и Беларусью в сфере культуры и искусства успешно развивается уже на протяжении довольно долгого периода. 25 ноября 1992 г. было заключено соглашение о культурном сотрудничестве между Правительством Республики Беларусь и Правительством Китайской Народной Республики. В статье 2 данного соглашения определены следующие основные направления сотрудничества между двумя странами в отрасли культуры и искусства: гастроли исполнителей и художественных коллективов; организация концертов, спекта-